*Д. А. Доўгаль,*
дацэнт кафедры пачатковай адукацыі і лінгвадыдактыкі
(Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова)

# АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ «ПАЧАТКОВАЯ АДУКАЦЫЯ» ДА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ ПАЗАКЛАСНАЙ РАБОТЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРНЫМ ЧЫТАННІ

Пазакласная работа – гэта арганізаваная і мэтанакіраваная дзейнасць, якая ажыццяўляецца педагогам у пазаўрочны час для пашырэння і паглыблення ведаў, уменняў і навыкаў, для развіцця самастойнасці і індывідуальных здольнасцей вучняў. У канцэпцыі вучэбнага прадмета “Беларуская мова” на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі спецыяльна адзначана важнасць як пастаянна дзеючых (у першую чаргу факультатываў),



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

так і эпізадычных мерапрыемстваў: алімпіяд, віктарын, конкурсаў, выстаў, экспедыцый, індывідуальных і калектыўных творчых спраў. Тым не менш пытанні падрыхтоўкі студэнтаў да ажыццяўлення пазакласнай работы па мове і чытанні не знайшлі адлюстравання ў тыпавой вучэбнай праграме дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання» (рэг. № ТД-А.579/тып., зацверджана 20.05.2015). Між тым, неабходнасць падрыхтоўкі студэнтаў да такой дзейнасці тлумачыцца не толькі важнасцю пазакласнай работы ў сістэме навучання і выхавання, але і сітуацыяй білінгвізму, пры якой сфера выкарыстання беларускай мовы абмежавана вучэбнымі заняткамі, што не дазваляе фарміраваць моўную асобу малодшага школьніка сродкамі толькі ўрочнай работы.

З мэтай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў да ажыццяўлення гэтай дзейнасці ў вучэбную праграму па методыцы выкладання беларускай мовы і чытання для студэнтаў спецыяльнасці «Пачатковая адукацыя» МДУ імя А. А. Куляшова была ўведзена тэма «Методыка пазакласнай работы па беларускай мове», для засваення якой прадугледжаны лекцыйныя і практычныя заняткі. Лекцыя для студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі раскрывае змест, задачы і прынцыпы пазакласнай работы па беларускай мове і літаратурным чытанні ў пачатковых класах. Разглядаюцца формы пазакласнай работы па колькасці ўдзельнікаў і часе правядзення. Кожная з вылучаных форм (масавая – групавая – індывідуальная, рэгулярная – эпізадычная) ілюструецца прыкладамі з рэальнай адукацыйнай практыкі. Дзякуючы гэтаму, студэнты знаёмяцца з існуючымі на дадзены момант на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі факультатыўнымі курсамі па мове і чытанні, іх вучэбна-метадычным забеспячэннем, распаўсюджанымі формамі працы з адоранымі і высокаматываванымі вучнямі (прадметнымі алімпіядамі, інтэлектуальнымі конкурсамі), мэтамі і кірункамі гуртковай работы, асобнымі ініцыятывамі, скіраванымі на павышэнне цікавасці школьнікаў да беларускага слова (напрыклад, беларускі чацвер ва ўстановах адукацыі Магілёўшчыны). Ілюстрацыйным матэрыялам служаць відэазапісы пазакласных мерапрыемстваў, праведзеных студэнтамі завочнай формы атрымання адукацыі МДУ імя А. А. Куляшова – педагогамі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Для азнаямлення з методыкай правядзення пазакласных мерапрыемстваў з малодшымі школьнікамі праводзяцца практычныя заняткі ў форме кіруемай самастойнай работы. Студэнты атрымліваюць групавое заданне па падрыхтоўцы пазакласнага мерапрыемства па белару-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

скай мове / чытанні. Кожная група рыхтуе мерапрыемства пэўнага тыпу: інтэлектуальная гульня (віктарына) па беларускай мове, літаратурны ранішнік, тэатралізаванае прадстаўленне (выхаваўчае мерапрыемства з элементамі тэатралізацыі), пазакласнае мерапрыемства краіназнаўчай скіраванасці. Асновай сцэнарыя, як правіла, становяцца распрацоўкі педагогаў-практыкаў і метадыстаў, апублікаваныя ў навукова-метадычным часопісе «Пачатковая школа». Пры жаданні кожная група можа скласці для працы арыгінальны сцэнарый.

Праца над мерапрыемствам уключае ў сябе некалькі этапаў:

– падрыхтоўчы (азнаямленне са сцэнарыем мерапрыемства, размеркаванне роляў і абавязкаў у групе, распрацоўка абсталявання, падбор наглядна-гукавога суправаджэння, рэпетыцыі мерапрыемства),

– этап правядзення (усе групы прэзентуюць сваю дзейнасць і ўдзельнічаюць у мерапрыемствах іншых творчых груп – такім чынам студэнты атрымліваюць вопыт удзелу ў мерапрыемствах рознага тыпу ў ролі як педагогаў, так і навучэнцаў),

– аналітычны (пасля выступлення кожнай групы адбываецца абмеркаванне як канкрэтнага мерапрыемства, так і ўсіх мерапрыемстваў дадзенага тыпу, робяцца высновы аб асаблівасцях падрыхтоўкі і правядзення пазакласных мерапрыемстваў),

– заключны (падрыхтоўка творчай справаздачы аб мерапрыемстве ў выглядзе паведамлення ў факультэцкай суполцы сацыяльнай сеткі або на афіцыйным сайце факультэта).

Такім чынам, студэнты практычна асвойваюць усе этапы падрыхтоўкі пазакласнага мерапрыемства, за выключэннем планавання, якое прадугледжвае выбар канкрэтнага мерапрыемства ў адпаведнасці з патрэбамі вучняў і планамі выхаваўчай работы ў класе і школе.

Вывучэнне дадзенай тэмы праводзіцца на заключным этапе засваення дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання», таму якасць праведзеных мерапрыемстваў дазваляе меркаваць аб узроўні маўленчай і метадычнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў. Навыкі правядзення беларускамоўных фрагментаў мерапрыемстваў студэнты атрымліваюць на працягу ўсяго курса, арганізуючы (гэты абавязак ускладзены на дзяжурных) у пачатку практычных заняткаў непрацяглыя па часе (да дзесяці хвілін) рухомыя ці інтэлектуальныя гульні са зборніка «Скарбонка гульняў» [1] для ўсіх членаў вучэбнай групы.

Для студэнтаў выпускных курсаў спецыяльнасці «Пачатковая адукацыя» прадугледжана вучэбная дысцыпліна «Актуальныя праблемы



Электронный архив Библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

методыкі выкладання мовы і літаратуры ў пачатковых класах», у межах якой яны працягваюць вывучэнне эфектыўных форм арганізацыі пазакласнай дзейнасці па мове і літаратуры.

Акрамя вучэбнай работы па прадметах метадычнага цыкла, фарміраванню навыкаў арганізацыі і правядзення пазакласных мерапрыемстваў па-беларуску спрыяе разнастайная выхаваўчая работа, якая праводзіцца выкладчыкамі на факультэце або ў асобных вучэбных групах: акцыя «ЧытайЛета» (падрыхтоўка ролікаў аб прачытаных кнігах беларускіх пісьменнікаў), наведванне беларускамоўных пастановак магілёўскіх тэатраў або кінапаказаў, акцыі да Міжнароднага дня роднай мовы, сустрэчы з майстрамі слова, музейныя квесты [2], наведванне мемарыяльных мясцін класікаў беларускай літаратуры, літаратурныя вечарыны і іншыя.

Такім чынам, падрыхтоўка студэнтаў спецыяльнасці «Пачатковая адукацыя» да ажыццяўлення пазакласнай работы па мове і чытанні арганізуецца сродкамі як вучэбных дысцыплін, так і ідэалагічнай і выхаваўчай работы, якая праводзіцца ва ўніверсітэце і на факультэце. Важнасць гэтага кірунку вучэбна-выхаваўчай работы абумоўлена значэннем пазакласнай работы ў фарміраванні моўнай асобы малодшага школьніка.

## Спіс літаратуры


1. Скарбонка гульняў / склад. І. Губарэвіч. – Мінск : СПГА «Чазенія», ГГА «Цэнтр Супольнасць», 2005. – 108 с.
2. Доўгаль, Д. А. Музейны квест як форма арганізацыі вучэбных заняткаў / Д. А. Доўгаль // Итоги научных исследований ученых МГУ имени А. А. Кулешова 2016 г. : материалы науч.-метод. конф., 25 янв. – 1 фев. 2017 г. / под ред. Е. К. Сычовой. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2017. – С. 174–176.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова